

*Камуністычныя суботнікі з'яўляюцца незвычайна каштоўнымі, як фактычны пачатак камунізму.*

*Ульянов (Ленин)*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 15 (1127) ● Чацвер, 22 красавіка 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ

Сёння спаўняецца 106 гадоў з дня нараджэння У. І. Леніна. У абстаноўцы вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму адзначае савецкі народ гэту знамянальную дату. На кожным кроку нашага жыцця адчуваецца веліч зробленага, дасягнутага пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, ажыццёўленага па запаветах правадыра.

У гераічны летапіс камуністычнага будаўніцтва яркай старонкай увайшоў працоўны подзвіг савецкіх людзей па ажыццяўленню гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Вышэйшай мэтай эканамічнай палітыкі партыі быў і застаецца няўхільны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове дынамічнага і прапарцыянальнага развіцця грамадскай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадукцыйнасці працы, усямернага паляпшэння якасці работы ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі.

Дзесятая пяцігодка—гэта новы этап у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, дасканаленні грамадскіх адносін і фарміраванні новага чалавека, развіцці савецкага ладу жыцця. Яна павінна стаць пяцігодкай эфектыўнасці і якасці. Пад гэтым дэвізам шырыцца і мацнее сацыялістычнае спаборніцтва першага года пяцігодкі, іменна ў гэтым якраз і праяўляюцца новыя, сапраўды камуністычныя адносіны да працы, якія так высока цаніў Ленін. У самаадданых клопатах людзей «аб павелічэнні прадукцыйнасці працы, аб ахове кожнага пуда хлеба, вугалю, жалеза» ён бачыў пачатак камунізму.

Ільіч напісаў аб гэтым у сваёй выдатнай працы «Вялікі пачын». І сёння мы ўпэўнена гаворым: традыцыі вялікага пачыну працягваюцца. Аб гэтым сведчыць магутнае шэсце мінулай «чырвонай суботы». 17 красавіка мільёны людзей выйшлі на свае рабочыя месцы і працавалі з поўнай аддачай, па-ўдарнаму, прадэманстравалі сваю бязмежную вернасць рэвалюцыйным ідэалам, роднай партыі, справе Леніна. Самаадданай працай адзначылі гэты дзень студэнты і супрацоўнікі нашага універсітэта. Усенародны камуністычны суботнік з'явіўся яшчэ адным сведчаннем таго, што кожны савецкі чалавек клапоціцца аб тым, як лепш, больш дастойна адказаць на гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС, на абвешчанае партыяй у якасці галоўнай задачы пяцігодкі павышэнне народнага дабрабыту. Нашчадкі вялікага пачыну працавалі з ясным усведамленнем таго, што ажыццяўленне эканамічнай праграмы, вызначанай на новую пяцігодку, яшчэ больш умацуе магутнасць нашай Радзімы, узніме яе міжнародны аўтарытэт.

Ужо больш трох дзесяцігоддзяў савецкія людзі жывуць і працуюць ва ўмовах міру. І заслуга ў гэтым Камуністычнай партыі, якая цвёрда і паслядоўна праводзіць ленінскую знешнюю палітыку, накіраваную на забеспячэнне трывалага міру.

Планы партыі—планы народа. Савецкія людзі бязмежна вераць партыі і адданы ёй.

Мы цвёрда ідзём наперад ленінскім курсам! У гэтым сіла нашага грамадскага ладу, аснова яго непераможнасці, залог новых поспехаў па шляху да камунізму.

## МАРШ ПРАЦОЎНАГА НАТХНЕННЯ

### УДАРНАЙ ПРАЦАЙ СУСТРЭЛІ ПЕРШЫ КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК ДЗЕСЯТАЙ ПЯЦІГОДКІ СТУДЭНТЫ І СУПРАЦОЎНІКІ БДУ

### ГЕАФАК

Каля 300 студэнтаў геаграфічнага факультэта працавалі ў дні «чырвонай суботы» на базе сельгастэхнікі; 70 чалавек займаліся нарыхтоўкай бульбы для студэнтаў-практыкантаў на вучэбнай базе Валожынскага раёна. Каля 7,5 тоны бульбы перабрана і перавезена ў сховішчы, перанесена 12 тысяч штук цаглін, падрыхтаваны ямы для пасадкі кустоў. Частка студэнтаў працавала на універсітэцкіх аб'ектах, на ўборцы аўдыторый вучэбнага корпуса.

### ФІЗФАК

Выдатнай працай зарэкамендавалі сябе студэнты І і ІІ курсаў фізфака на аб'екце ДЭУ Кастрычніцкага раёна, кіраўніцтва якога было вельмі удзячна студэнтам. З вялікім энтузіязмам працавалі будучыя фізікі ў новым радыёфізічным корпусе, што ў Шчомыслiцах, на ваеннай кафедры, у старым фізічным корпусе.

### МЕХМАТ

Добра папрацавалі студэнты і супрацоўнікі факультэта на пасадачных участках зялёнай гаспадаркі Кастрычніцкага раёна, на бульвары, у раёне Курасоўшчыны. Асабліва вызначыліся на суботніку студэнты IV і II курсаў, якія працавалі пад кіраўніцтвам куратараў І. Сакалова, В. Яравенкі, А. Ноткіна, В. Савенкава і іншых.

### ФІЛФАК

Актыўны ўдзел у правядзенні суботніка прынялі студэнты філалагічнага факультэта. На працягу тыдня вялася работа ў ДЭУ, у друкарні, у канторы зялёнай гаспадаркі.

### ГІСТФАК

609 студэнтаў і супрацоўнікаў гістфака выйшлі працаваць у дзень «чырвонай суботы» на рабочыя аб'екты. 198 студэнтаў працавалі на ўчастках зялёнай гаспадаркі Кастрычніцкага раёна. Каля 300 — у залах бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна, частка студэнтаў працавала ў інтэрнаце № 1.

Добрых водгукаў заслугоўвае праца студэнтаў трэцяй групы І курса, першай групы ІІІ курса, ІІІ курса аддзялення палітэканоміі.



У сонцы далі ясныя
іскрацца,
І на планеце—
зыркая вясна.
Наш кожны крок
у заўтра—
наша праца,
Якой мы
аддаём сябе
спаўна.

## З УЗНАГАРОДАЙ, ТАВАРЫШЫ!

*Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР*

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ СССР РАБОТНІКАЎ ВЫШЭЙШЫХ І СЯРЭДНІХ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ СССР

**За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў дзевятай пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі ўзнагародзіць**

**па гораду Мінску:**

**ОРДЭНАМ ЛЕНІНА**

**Малышава** Андрэя Якаўлевіча— прафесара, прарэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА**

**Сікорскага** Усевалада Міхайлавіча — члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларускай ССР, рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**ОРДЭНАМ «ЗНАК ПАШАНЫ»**

**Зяцькова** Івана Паўлавіча — дацэнта, дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Ліўшыца** Гілера Мордухавіча — прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**МЕДАЛЁМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»**

**Далгарукава** Валерыя Сцяпанавіча — начальніка вучэбнага аддзела Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Казлову** Вольгу Васільеўну — дацэнта, загадчыцу кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**МЕДАЛЁМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»**

**Дудзіча** Міхаіла Міхайлавіча — вадзіцеля аўтамабіля Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ПАДГОРНЫ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ГЕАРГАДЗЕ.**

Масква, Крэмль.
15 сакавіка 1976 г.

# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ



# НА ВЫСОКІМ ПАЛІТЫЧНЫМ УЗРОЎНІ

Ва універсітэце, на яго факультэтах і ў іншых падраздзяленнях поўным ходам ідзе падрыхтоўчая работа па правядзенню справаздач і выбараў у групах народнага кантролю. У некаторых падраздзяленнях справаздачна-выбарныя сходы (канферэнцыі) ужо адбыліся. На працягу красавіка яны будуць праведзены на астатніх факультэтах, а ў канцы мая пройдзе універсітэцкая канферэнцыя.

Справаздачы і выбары ў групы і пасты народнага кантролю — важная палітычная кампанія, якая павінна забяспечыць далейшае ўдасканаленне і актывізацыю дзейнасці органаў народнага кантролю. Таму ёй надаецца вялікае значэнне. Пасля інструкцыйнай нарады, арганізаванай раённым камітэтам народнага кантролю, праведзена нарада старшынь груп народнага кантролю факультэтаў і іншых падраздзяленняў універсітэта, на якой падрабязна абмеркаваны пытанні падрыхтоўкі да справаздач і выбараў. Двойчы гэтае пытанне ўключалася ў парадак дня паседжанняў ГНК БДУ і яе бюро. Вызначаны тэрміны правядзення справаздачна-выбарных сходаў (канферэнцый), назначаны адказныя за іх правядзенне ад ГНК універсітэта.

Справаздачна-выбарная кампанія праходзіць у абстаноўцы вялікага палітычнага ўздыму, выкліканага рашэннямі XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, разгарнуўшайся ў краіне ўсенароднай барацьбой за ажыццяўленне задач, намечаных партыяй на дзесятую пяцігодку. Значна актывізавалася і дзейнасць груп народнага кантролю. Многа добрага можна сказаць і аб большасці народных кантралёраў нашага універсітэта. Нядаўна рашэннем рэктарата, парткома і мясцкома былі ўзнагароджаны Ганаровай граматай БДУ групы народнага кантролю хімічнага (старшыня Г. Васільева) і біялагічнага факультэтаў (старшыня Е. Тарасевіч), а таксама найбольш вызначыўшыяся народныя кантралёры: Е. Акінчыц, А. Андрэеў, Л. Кірыла, М. Кніга, Л. Пясткоўская, Е. Тагуноў і І. Цюніс.

Метад работы лепшых груп народнага кантролю факультэтаў павінен стаць здабыткам усіх астатніх груп. Абмену вопытам будуць прысвечаны чарговыя заняткі школы народных кантралёраў, якія адбудуцца ў маі.

У ходзе падрыхтоўкі да правядзення справаздач і выбараў кожнай групе народнага кантролю неабходна ўсебакова прааналізаваць сваю дзейнасць у святле ўказанняў ЦК КПСС, якія адзначаны ў пастанове «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР», праверыць, у якой меры рэалізаваны крытычныя заўвагі, прапановы і наказы папярэдняга справаздачнага сходу (канферэнцыі), абагульніць станоўчы вопыт работы, выявіць недахопы. Справаздачны даклад групы народнага кантролю ў пісьмовым выглядзе спачатку абмяркоўваецца і зацвярджаецца на сходзе народных кантралёраў, узгадняецца з партыйным бюро, а затым ужо прадстаўляецца канферэнцыі (сходу). Загадзя падрыхтоўваецца праект пастановы канферэнцыі (сходу), у якім абавязкова павінны змяшчацца таксама наказы ўноў выбранаму саставу ГНК. У састаў ГНК неабходна выбраць найбольш дастойных, аўтарытэтных і актыўных таварышаў, здольных выканаць ганаровыя і адказныя абавязкі дазорных. У мэтах захавання пераемнасці пажадана зноў выбраць тых народных кантралёраў, якія ў ранейшым саставе ГНК станоўча зарэкамендавалі сябе на гэтай рабоце. Пры гэтым належыць прытрымлівацца апраўдаўшай сябе практыкі, калі групы народнага кантролю ўзначальваюць намеснікі сакратароў партарганізацый.

На справаздачна-выбарных сходах (канферэнцыях) факультэтаў (падраздзяленняў) выбіраюцца прадстаўнікі на агульнауніверсітэцкую канферэнцыю па вызначаных нормах прадстаўніцтва. Галасаванне (як і пры выбранні народных кантралёраў) праводзіцца адкрыта.

Пасля правядзення справаздачна-выбарных канферэнцый (сходаў) і арганізацыйных паседжанняў уноў выбраных груп народнага кантролю (на гэтых паседжаннях адкрытым галасаваннем выбіраюцца старшыня групы, яго намеснікі, кіраўнікі сектараў, а ў групах, дзе налічваецца не менш 15 чалавек,— таксама бюро групы) неабходна старанна абагульніць усе крытычныя заўвагі, прапановы, якія былі выказаны на справаздачных сходах, намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, якія забяспечаць рэалізацыю наказаў працоўных. Аб выкананні гэтых наказаў патрэбна перыядычна інфармаваць калектыў. Уноў выбранаму кіраўніцтву груп трэба прадумаць размеркаванне абавязкаў паміж кантралёрамі, улічваючы іх пажаданні, вопыт работы, дзелавыя якасці, а затым увесь час накіроўваць і кантраляваць іх работу па выкананню заданняў, прадугледжаных перспектыўным (гадавым) і квартальнымі планамі.

Пад кіраўніцтвам і пры дапамозе партыйных арганізацый неабходна так падрыхтаваць і правесці справаздачы і выбары груп народнага кантролю, каб яны прайшлі на высокім палітычным узроўні і садзейнічалі далейшаму паляпшэнню работы народных кантралёраў, удасканаленню стылю і метадаў іх дзейнасці ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ.

**І. ЦІШКЕВІЧ,**
намеснік сакратара парткома універсітэта па народнаму кантролю.

# ПА ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ

Група народнага кантролю, праверыўшы стан НДР студэнтаў на геаграфічным і філалагічным факультэтах, адзначае, што на факультэтах асноўная ўвага ўдзяляецца пастаноўцы і кіраўніцтву НДР студэнтаў па лініі СНТ.

На геаграфічным факультэце, дзе пытанні стану і мер па паляпшэнню работы СНТ абмяркоўваюцца на паседжаннях савета факультэта, створана камісія па развіццю і ўдасканаленню НДР на 1976—1980 гады.

Асноўныя напрамкі работы студэнтаў: удзел у студэнцкіх канферэнцыях, алімпіядах, у рэспубліканскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ.

На факультэтах створаны саветы СНТ, якія ажыццяўляюць кіраўніцтва работай студэнтаў у гуртках, займаюцца падрыхтоўкай да правядзення канферэнцый, аглядаў-конкурсаў. На кожнай кафедры факультэта ёсць студэнцкі гурток, якім кіруюць кваліфікаваныя выкладчыкі.

Пры параўнанні работы двух саветаў СНТ неабходна адзначыць недастаткова добра пастаўленую работу па інфармацыі на філалагічным факультэце. Тут няма стэнда аб НДР студэнтаў. У час праверкі не было «Бюлетэня СНТ».

На стэндзе павінны быць спіс членаў савета СНТ, план яго работы, тэматыка работ студэнцкіх гурткоў на кафедрах і спіс адказных ад кожнай кафедры.

У якасці асноўнага паказчыка работы СНТ на факультэтах з'яўляюцца студэнцкія навуковыя канферэнцыі і рэспубліканскі агляд - конкурс студэнцкіх работ. З кожным годам колькасць дакладаў і работ па агляду расце. Так, у 1975 годзе геаграфічным факультэтам прадстаўлена 56 работ (15, 29, 12) адпаведна I, II, III катэгорый. Усё ж асноўную колькасць работ на агляд прадстаўляюць, як правіла, студэнты старэйшых курсаў, у асноўным V курса (у прыватнасці на геафаку 32 з 56 — V курс, 3 работы — студэнтаў I, II і III курсаў).

Не ўсе выкладчыкі кафедр аднолькава актыўна працуюць са студэнтамі па лініі СНТ (на філалагічным са 113 толькі 45—50 рэгулярна ўдзельнічаюць у прадстаўленні студэнцкіх работ на агляд).

Аналізы праверак паказалі, што ў мэтах паляпшэння НДР студэнтаў трэба ў першую чаргу арганізаваць на факультэтах рэгулярны выпуск «Бюлетэня СНТ», прыцягнуць да ўдзелу ў рабоце СНТ большую частку выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў лабараторый.

**М. СОКАЛАЎ,**
**кіраўнік сектара навуковай работы ГНК БДУ імя У. І. Леніна.**

# ГАЛОСНАСЦЬ ПАМНАЖАЕ ДЗЕЙСНАСЦЬ

Органы народнага кантролю, запісана ў «Палажэнні аб органах народнага кантролю», якое зацверджана ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР, займаюць важнае месца ў грамадскім жыцці калектываў, з'яўляюцца адной з форм сацыялістычнай дэмакратыі. Праз іх шырокія масы працоўных устанаўліваюць кантроль у галіне эканомікі, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, удзельнічаюць у кіраванні справамі дзяржавы.

Адным з важнейшых прынцыпаў, пакладзеных у аснову дзейнасці народнага кантролю, з'яўляецца сфармуляваны і тэарэтычна абгрунтаваны У. І. Леніным прынцып галоснасці.

Галоснасць — не самамэта ў дзейнасці груп народнага кантролю. Яе значэнне заключаецца ў тым, што яна дапамагае хутчэй і глыбей зразумець, абдумаць тыя ці іншыя з'явы, працэсы, якія ўзнікаюць у працоўным калектыве, і своечасова аказаць на іх неабходнае ўздзеянне; дазваляе своечасова ўбачыць і распаўсюдзіць усё каштоўнае, станоўчае, што ўдалося выявіць у ходзе праверак; дае магчымасць своечасова выявіць недахопы і аказаць дзейсную дапамогу калектыву па іх ухіленню.

Галоснасць з'яўляецца добрым сродкам выхавання кадраў, павышэння іх адказнасці за даручаную справу. Нарэшце, неабходна адзначыць і выхаваўчае ўздзеянне галоснасці на саміх народных кантралёраў.

На жаль, даводзіцца канстатаваць той факт, што ў шэрагу груп народнага кантролю да цяперашняга часу не аформлены стэнды з інфармацыяй аб рабоце народных кантралёраў. Факультэцкія групы народнага кантролю не ў поўную сілу сваіх магчымасцей выкарыстоўваюць насценны друк, старонкі шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт».

У мэтах абмену і абагульнення вопыту работы універсітэцкая група народнага кантролю прыняла рашэнне аб правядзенні з 10 па 20 мая 1976 года агляду сродкаў галоснасці ў рабоце груп народнага кантролю. Група народнага кантролю універсітэта заклікае ўсе факультэцкія групы прыняць самы актыўны ўдзел у маючым адбыцца аглядзе і выражае ўпэўненасць у тым, што агляд дазволіць нам укараніць галоснасць у работу ўсіх груп і памножыць сілу народнага кантролю, павысіць яго эфектыўнасць у жыцці нашага калектыву.

**А. АКІНЧЫЦ,**
**намеснік старшыні ГНК БДУ імя У. І. Леніна.**

# МАСТАКІ—ЗАПАЗЫЧНІКІ




Гісторыя дакладна не ведае, калі паявілася племя чытачоў, якія забываюць вярнуць узятыя кнігі або нядбайна адносяцца да іх. Затое дакладна вядома, што ў Старажытным Егіпце тыя, хто губляў скрутак папірусу з бібліятэкі фараона, караліся смерцю, а за неакуратныя адносіны да «кнігі» вінаваты атрымліваў 200 палачных удараў.

Вядомы кнігалюб Фрыдрых Вялікі ў падобных выпадках, праўда, абмяжоўваўся турэмным зняволеннем, прычым максімальны тэрмін ні разу не перавысіў 20 гадоў.

Аднак, нягледзячы на ўсе строгасці, чытачы, якія затрымліваюць кнігі, ніяк не пераводзяцца. Напрыклад, у 1975 годзе ў шэфілдскую гарадскую бібліятэку была вернута кніга «Вучыся вязаць і вышываць», якую забыўчывая чытачка пратрымала 43 гады. Але і такую пратэрміноўку нельга лічыць чымсьці незвычайным. У чэрвені 1960 года бібліятэка норыджскага кафедральнага сабора ў Англіі вярнула цэнтральнай лонданскай бібліятэцы кнігу, якая выйшла ў свет у 1650 годзе і была ўзята «па міжбібліятэчнаму абанементу» недзе паміж 1732 і 1819 гадамі.

І ўсё ж такі рэкорд забыўчывасці ўстаноўлен у бібліятэцы каледжа Сідні Сасекса ў Кембрыджы, дзе кніга, якую ўзяў палкоўнік Роберт Уолпол, вярнулася праз 300 гадоў.

Цікава, а як жа ў нас? Канешне, нам далёка да такіх рэкордаў, як у Кембрыджы, але...

Давайце з вамі зазірнем у бібліятэку. Бачыце, роўнымі радамі стаяць на паліцах фармуляры чытачоў. Але што гэта? «Запазычнікі дзённага аддзялення», «Запазычнікі вячэрняга аддзялення». Ці не праўда, даволі красамоўны надпіс?

З 1972 года «чытае» 15 кніг М. Антава, напамяць можа расказаць змест 13



падручнікаў, якія чытае ўжо чацвёрты год, Л. Маёранка з ФПМ. Завочніцы геафака С. Ленартовіч быў ужо зроблен пісьмовы напамін, але, як гаворыцца, «успамінай, як звалі» гэтыя кніжкі. І ўсё ж такі «пераможцамі» сярод запазычнікаў на даным перыядзе сталі студэнты-вячэрнікі хімічнага і біялагічнага факультэтаў М. Скарынка і Л. Рэўко: на іх рахунку з 1971—72 гадоў па сягонняшні дзень знаходзіцца па 14, 16 падручнікаў!

Але гэта яшчэ не ўсё. Вось у баку стаіць салідны шэраг кніг. Адкрыйце першую старонку «Фізічных асноў механікі» С. Хайкіна. Не, зусім не формулы і лічбы сустракаюць нас, а звычайны чалавечак, намаляваны рознакаляровым чарнілам. Гартаем далей —формулы, але тоўста абведзеныя і падкрэсленыя ручкай, надпісы на палях. Пасля першага выкарыстання абсалютна новы падручнік «Навуковы атэізм» застаўся распісаны вельмі «змястоўнымі» і «выразнымі» выказваннямі.

Спіс гэтых сапсаваных кніг можна прадаўжаць яшчэ і яшчэ. Не будзем зараз называць прозвішчы «мастакоў алоўка і слова», напэўна, яны і самі пазналі сваё майстэрства, але хочацца спытаць, адкуль у гэтых студэнтаў бярэцца такая непавага да кніг, да сваіх сяброў, якім, у адрозненне ад «аўтараў», гэтыя фразы, лініі, фігуркі перашкаджаюць сканцэнтраванай рабоце з падручнікамі? Ці патрэбна тады гаварыць пра культуру чалавека, які не можа абыходзіцца нават з кнігай? Патрэбна, таму што такіх прыкладаў у нас, на жаль, нямала. І быць гэтаму непарадку ці не быць, залежыць толькі ад саміх жа студэнтаў-чытачоў.

**І. САВЕТКІНА.**

# ВАКОЛ ПРАБЛЕМЫ ТРОЙКІ

**Гутарка нашага карэспандэнта С. Шыдлоўскай з адказнай за акадэмічны сектар камітэта камсамола геафака Т. Раманюк.**

**Карэспандэнт:** Зімовая сесія закончылася два месяцы назад. Але да яе вынікаў мы будзем звяртацца не раз. Адзнакі ў залікоўках — тыя крытэрыі і арыенціры, па якіх ацэньваецца якасць падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Сярэдні бал паспяховасці на геаграфічным факультэце — 3,89, паспяваючых — 91,9 працэнта, што на 3,3 працэнта ніжэй, чым у мінулую зімовую сесію. Чаму многа троек?

**Раманюк:** Усе «рэкорды» пабілі першакурснікі. Сярэдні бал паспяховасці упаў іменна з-за таго, што дрэнна здалі сесію студэнты I курса: толькі 80,9 працэнта паспяваючых. Магчыма, у гэтым ёсць частка віны камітэта камсамола факультэта. Не падказалі ў свой час, як вучыцца, не пракантралявалі... А здарылася «звычайная» гісторыя: аслабаніўшыся ад нагляду школьных настаўнікаў, не навучыўшыся як след арганізаваць свой час, першакурснікі слаба рыхтаваліся на працягу семестра. За некалькі дзён перад экзаменам асіліць матэрыял цяжка. На I курсе ёсць група, дзе паспяховасць склала 3,35 бала.

А ўсяго са 134 чалавек парог выдатнікаў пераступілі толькі чацвёра.

**Карэспандэнт:** А вы не задумваліся аб прычынах тройкі ўвогуле? Несістэматычнасць працы — ад выпадку да выпадку — адна з галоўных прычын «шэрай» адзнакі. Але вось другая прычына — імкненне пражыць з найменшымі затратамі фізічнай і духоўнай энергіі. Між тым вялікая падмога ў вучобе — агульная эрудыцыя і культура чалавека. Зразумела, нялёгка сумяшчаць падрыхтоўку да заняткаў з наведваннем тэатраў, музеяў і выстаў, чытаннем мастацкіх кніг. Але нездарма ў апошні час загаварылі пра расцяжнасць часу. Умясціць у свае суткі як мага больш — сакрэт поспехаў многіх людзей. Уменнем вучыцца вылучаецца I група III курса вашага факультэта. Тут — ніводнага чалавека з тройкай. А што перашкаджае іншым групам быць у ліку лепшых?

**Раманюк:** Канешне, лянота і інертнасць мыслення — не адзіныя «хваробы» студэнта. Але трэба падыходзіць да праблемы тройкі ўсебакова. Спецыфіка заняткаў на геаграфічным факультэце ў тым, што падрыхтоўка да семінараў, залікаў і экзаменаў праходзіць у кабінетах. На ўсіх не хапае вучэбнай літаратуры. Добра, калі ва універсітэцкай бібліятэцы знойдзецца 8—10 падручнікаў. Многія дапаможнікі не перавыдаваліся з даўніх часоў.

А вось яшчэ адна немалаважная абставіна. Нам выкладаюць шмат прадметаў з самых розных галін ведаў: хімію, фізіку, матэматыку, біягеаграфію і г. д. Плюс спецыяльныя дысцыпліны. Складана быць абсалютным знаўцам у такім шырокім дыяпазоне.

**Карэспандэнт:** Я мяркую, што акадэмсектар геафака пасля сесіі зрабіў адпаведныя вывады. У вас умацаваўся кантроль за наведваннем, нядаўна праводзіўся месячнік наведвання. А яшчэ?

**Раманюк:** У гэтым семестры мы выпускаем акадэмбюлетэнь, «баявыя лісткі», «маланкі». Вынікі праверак вывешваем пад рубрыкамі «Сёння ўперадзе» і «Не праходзьце міма». Злосныя прагульшчыкі і «хвасцісты» выклікаюцца на паседжанні бюро камітэта камсамола...

**Карэспандэнт:** І тым не менш гэтага мала. Не стаў баявым і дзейсным памочнікам «Камсамольскі пражэктар». Рэдка калі завітаюць студэнты старэйшых курсаў да сваіх малодшых сяброў. Таму першакурснікам даводзіцца вучыцца не на чужых, а на сваіх памылках. Ідзе час, а ў выніку — тройка. Што датычыцца кансультацый то іх можна арганізоўваць і ў інтэрнатах.

Відавочна, камітэт камсамола выкарыстаў далёка не ўсе магчымасці для павышэння паспяховасці студэнтаў. Але многае яшчэ можна зрабіць і выправіць.

**АД РЭДАКЦЫІ. Спадзёмся, што гэта гутарка будзе карыснай не толькі для членаў камітэта камсамола і студэнтаў геаграфічнага факультэта, але і для актыву іншых факультэтаў. Мы чакаем ажыўленага абмеркавання праблемы, выступленняў адказных за акадэмічны сектар, выкладчыкаў і студэнтаў.**

---

**Я ОТТУДА, ГДЕ МУСКУЛАМ — ВОЛЯ, А МОЗОЛИ — ОБЫДЕННЫЙ ФАКТ. ХЛЕБОПАШЦЕМ С КОЛХОЗНОГО ПОЛЯ Я УЧИТЬСЯ ПРИШЁЛ НА РАБФАК.**
(З насценгазеты «Рабфаковец-76»).

# ГАЛОЎНАЕ—ВУЧОБА

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення — гэта перадавыя працаўнікі народнай гаспадаркі, былыя воіны Узброеных Сіл. За час навучання наша камсамольская арганізацыя з'ядналася ў адзіны моцны калектыў. Многае зрабілі камсамольцы па дастойнай сустрэчы XXV з'езда КПСС. Першым падарункам з'езду была праца на будаўніцтве. Мы ўзяліся дапамагчы будаўнікам навесці чысціню ў адным з будучых карпусоў Дома ўрада. Слухачы факультэтаў журналістыкі і юрыдычнага на працягу двух тыдняў працавалі на будаўніцтве, па вечарах рыхтаваліся да заняткаў. Вызначыліся Міхаіл Халімончык, Таццяна Бародзіч, Наталля Галавенка.

Галоўнае ў нашым жыцці — гэта вучоба. Таму камітэт камсамола рабфака звярнуў на яе асаблівую ўвагу. Адным вучоба даецца лёгка, другім — з вялікімі цяжкасцямі. Каб палепшыць засваенне матэрыялу, выкладчыкі праводзілі дадатковыя заняткі, на камсамольскіх сходах абмяркоўваліся важныя задачы камсамольцаў, да найбольш слабых у адносінах вучобы слухачоў былі замацаваны выдатнікі. На паседжанні камітэта камсамола аналізаваліся прычыны нездавальняючых адзнак, рабілася ўсё, каб іх пазбавіцца. У цяперашні час па вучобе на першае месца выйшла група слухачоў юрыдычнага факультэта, на другім — біёлагі, на трэцім — гісторыкі.

Самымі актыўнымі камсамольскімі групамі з'яўляюцца групы, дзе камсоргамі В. Дудко, А. Шалахман, Г. Цвірко, Л. Гайдукевіч. З вялікай удзячнасцю і цеплынёй гавораць слухачы пра куратараў Марыю Васільеўну Дабрыян, Ларысу Арцёмаўну Ісачанкаву, Леаніда Іванавіча Жалуновіча.

На рахунку камсамольскай арганізацыі аддзялення многа добрых спраў. Каб пазнаёміць актывістаў са структурай партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, студэнтам гістфака У. Карагіным на рабфаку была праведзена прапагандысцкая лекцыя. Праводзіліся таксама спартыўныя спаборніцтвы, культурна - масавыя мерапрыемствы.

На працягу года добра папрацавала рэдакцыя насценгазеты «Рабфакавец» на чале з Анатолем Срэбраковым.

Камсамольцы не раз арганізоўвалі экскурсіі па гістарычных месцах Мінска, наведалі Дом-музей I з'езда РСДРП, музей Якуба Коласа, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Многа зроблена, многа яшчэ наперадзе. Ёсць у дзейнасці камсамольскага актыву пэўныя недахопы. На працягу трох месяцаў не адбылося ніводнага канцэрта мастацкай самадзейнасці. Пры праверцы інтэрнатаў, дзе жывуць слухачы падрыхтоўчага аддзялення, выявілася, што санітарнае становішча памяшканняў не на належным узроўні.

**Л. КРЫЖ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола падрыхтоўчага аддзялення.**

# ГРУПА Ў НАС ТАКАЯ

Група гісторыкаў лічыцца адной з лепшых на падрыхтоўчым аддзяленні. Аб гэтым сведчаць не толькі вынікі I семестра (3-е месца), але і добрыя водгукі выкладчыкаў.

— Душа калектыву — Жэня Адамовіч, — гаворыць парторг групы Чумакоў. — Жэня добра вучыцца, добры спартсмен. Ірына Гарэлік — адказная за работу з маладымі камуністамі групы. Да яе можна звярнуцца з любым пытаннем, Іра заўсёды дапаможа таварышу. Пётр Аксючыц — фізорг. Часта па яго ініцыятыве хлопцы збіраюцца на стадыёне, гуляюць у футбол, валейбол. Ды што гаварыць, у нас уся група такая!

З першых жа заняткаў маладыя камуністы актыўна ўключыліся ў жыццё падрыхтоўчага аддзялення. Не ўсё спачатку ішло гладка. Асабліва цяжка абстаяла справа з навучаннем: сказаўся вялікі перапынак у вучобе. Але на тое і існуе акадэмічны сектар. Разам з куратарам Сяргеем Уладзіміравічам Пазняком былі вырашаны пытанні дапамогі адстаючым, уведзены дадатковыя заняткі. Гэта, вядома, дало жаданыя вынікі, ды і вучыцца стала намнога лягчэй і цікавей.

У вольны ад заняткаў час хлопцы і дзяўчаты часта збіраюцца разам, ходзяць у кіно, тэатры, наведваюць мастацкія выстаўкі. Усёй групай ездзілі ў Хатынь, на Курган Славы.

**Т. ШУЛЬГА.**

# ЗА ПАРАДАК У СВАІМ ДОМЕ

...Толькі што скончыўся агульны сход усіх жыхароў інтэрната № 3. Выбіралі лепшых прадстаўнікоў у студэнцкі савет. Пражылі разам усяго некалькі дзён, але армейская практыка большасці юнакоў, працоўная школа дзяўчат дала магчымасць распазнаць людзей, убачыць і ацаніць здольнасці кожнага. Прыйшлі паступаць ва універсітэт прама з прадпрыемстваў, з рабочых месц, з арміі, каб паглыбіць веды, здзейсніць сваю мару, даўно задуманую і канчаткова вырашаную.

Праз некалькі хвілін пасля сходу ішло першае паседжанне студэнцкага савета. Старшынёй выбралі Валерыя Сушко, за плячыма якога была служба ў арміі, два гады працы на прадпрыемстве. Потым замацавалі сектары, улічваючы тыя ці іншыя здольнасці чалавека, каб у кожнага была цікавасць да сваёй працы, натхненне.

Пачынаць, шчыра кажучы, патрэбна было з нуля. Студэнты, якія жылі ў інтэрнаце № 3 раней, не клапаціліся аб тых, хто заселіць гэтыя пакоі пасля іх. Не было нагляднай агітацыі, інтэрнат меў не зусім прыемны выгляд.

Спачатку звярнуліся за дапамогай да студсавета інтэрната № 1, затым схадзілі ў інтэрнат № 4. Справы наладзіліся. Афармілі наглядную агітацыю, пачаў працаваць насценны друк; вымытыя калідоры, сцены надалі памяшканням зусім іншы выгляд. Санітарная камісія арганізавала спаборніцтва за права насіць званне «лепшы пакой інтэрната». У канцы спаборніцтва пераможцам уручылі прыз—тэлевізар.

Потым было яшчэ шмат паседжанняў. Абмяркоўвалі пытанні на наступны месяц, пытанні, якія, як грыбы пасля дажджу, узнікалі па ходу справы амаль кожны дзень.

І вось нядаўна зноў адбыўся сход. Члены студсавета рабілі справаздачу аб праведзенай рабоце. Ацэнку яна атрымала добрую.

На адным месцы і камень абрастае, можа сказаць хто-небудзь. Згаджуся... Але пад ляжачы камень і вада не цячэ...

**У. БЕЛЬСКІ.**



*Нядаўна на факультэце журналістыкі адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя, на якой прысутнічалі госці з Львова, Казані, Кіева. Было прачытана больш 50 дакладаў, працавалі 4 секцыі.*

Фота **Л. Марцыёнкі.**

---

# «АДЗАВІСЯ, АДГУКНІСЯ...»

ФЕЛЬЕТОН



Ішла лекцыя.

«Цішыня, толькі чуюцца крокі цяжкіх, самаробных ботаў Ільі Іванавіча... Так праходзіць паўгадзіны, хіба хто-небудзь пазяхне ўголас... За ім пазяхне сусед, потым наступны, паволі, быццам па загаду, адкрывае рот. І гэтак далей: заразлівая гульня паветра ў лёгкіх абыйдзе ўсіх...» — выкладчык літаратуры закрыў кнігу Ганчарова «Абломаў» і ўзняў палец...

У гэты момант «ён» сумна акінуў позіркам спісаную і размаляваную парту, спадзеючыся знайсці на ёй незапэцканы лапік, і напісаў паверх усяго: «Адзавіся, адгукніся, хто чытае мае радкі!».

Хвілінку, скажуць мне. Якая лекцыя? Дзе яна адбывалася? Хто такі «ён»? Што азначае «мае радкі»? І ўвогуле, хто даў «яму» права псаваць дзяржаўную маёмасць?

Дазвольце, адкажу. Па-першае, не так важна, якая лекцыя. Гэта можа быць гісторыя літаратуры, крыміналістыка, філасофія і г. д. Паверце слову, яму гэта ўсё роўна. Па-другое, дзеянне магло і можа быць і на фізфаку, і на філфаку, і на геа-, бія-, жур-, юрфаку. Ён усюды ёсць. У гэтым лёгка пераканацца, калі зазірнуць нават у пустыя аўдыторыі. На пытанне — хто такі ён?— адказ адзіны: вядома ж, студэнт! Студэнт, які сумуе на занятках, пра якога кажуць: бібікі б'е. Прасцей кажучы, наведвальнік. Але хто — Іваноў ці Сідараў — удакладніць цяжка, таму што ён такі сціплы, што маўчыць пра тое, як вады ў рот набраўшы. Праўда, наведвальнік з аўдыторыі № 33 юрыдычнага факультэта, напісаўшы «Вова М., Юра А., Бора Н.», зрабіў у свой час такое-сякое намаганне стаць вядомым. Але актывісты з гэтай аўдыторыі палічылі надпіс недастаткова брудным, каб «прышыць» яго аўтару справу.

Аднак, згадзіцеся, не так ужо важна, хто напісаў «Іліаду»: Гамер ці, скажам, Маякоўскі. Галоўнае — ёсць непаўторная «Іліада»; галоўнае — тое, што напісана. А напісана наведвальнікамі шмат. Пакінем пытанне аб безгаспадарчых адносінах да дзяржаўнай маёмасці пакуль у баку. Давайце спачатку ўсвядомім: што ж гэта такое — «мае радкі».

Пачатак ім паклаў усё той жа студэнт-наведвальнік. Сядзеў-сядзеў ён на ўсіх лекцыях, ды ў гонар такой рэдкай з'явы ўзяў і напісаў на парце: «Тут быў я!» Хутка знайшліся прыхільнікі. Пасыпаліся надпісы: «І я!», «І мы!»... Зараз дастатковым было б пад гэтым накрамсаць: «Дуракі!», як новы апанент пэцкаў бы парту не менш «дасціпным» выразам: «Сам дурак!».

І пайшло... Наведвальнікі ўвайшлі ў смак, надпісаў станавілася ўсё больш. Кляксы распаўзаліся бруднымі плямамі па ўсіх партах. Удасканальвалася і новая форма гультайскага знаходжання на лекцыі. Неўзабаве яна набыла, так сказаць, «галіновы» характар. Юрысты пісалі ў такім плане: «Тут сядзеў Вася за мокрае», філолагі занатоўвалі азы тэорыі літаратуры:

«Я очень страшный.
Я очень страстный.
Не так страшен черт, как его рисуют».

Згадзіцеся, «сакавіты» каламбур.

Безнадзейна згасла і полымя любоўнага дыялогу. Толькі аганькі-допісы гаварылі пра вялікі «пажар», які бязлітасна сапсаваў дзяржаўную маёмасць.

Але аптымісты не пераваліся і да гэтага часу. Адшукваючы новыя чыстыя плошчы, «аматары жывога слова» пацІху пачынаюць асвойваць сцены. Ці проста крэмзаюць па напісанаму. Толькі з яшчэ большым націскам, гусцейшым чарнілам. І чыстых парт у памяшканнях застаецца ўсё менш і менш. Або іх зусім няма. Не верыце? Агледзьце тады аўдыторыі ў галоўным корпусе, на біяфаку, філфаку. Калі ж вы не жадаеце дарэмна марнаваць час, зазірніце толькі ў кіназал геафака, якім карыстаюцца студэнты амаль усіх факультэтаў: тут суквецце брудных парт прадстаўляе ўвесь букет штодзённых наведвальнікаў.

Адным словам, справы дрэнныя! Хутка не будзе дзе пісаць. Вось тут і прызадумаецца іншы пэцкальнік, ды ў роспачы і напіша: «Адзавіся, адгукніся, хто чытае мае радкі!»

Хто ж дапаможа аматару псавання мэблі? Хто адгукнецца? Можа, у гаспадарнікаў універсітэта пра гэта галава баліць? Мо зробяць яны зручныя лесвічкі, каб пісаць на сценах і столі? Ці, лепей, адшаруюць і адпаліруюць крышкі парт нанава? Бадай-што, не. Аднаго лаку колькі спатрэбіцца, не кажучы ўжо аб працы.

А што, калі штаб «КП» навядзе на думку факультэцкія камітэты камсамола зрабіць на першы раз суботнік, каб той жа студэнт, які да гэтага ўласнаручна крамсаў парты, будзе да поту шараваць, адмываць іх ад сваіх жа «аўтографаў»?

Давайце адгукнемся і дапаможам яму заняцца якой-небудзь справай, а то, барані божа, здарыцца так, як напісаў ён у адной з аўдыторый: «5 год упустую!».

**Г. МАРОЗАЎ.**

**АД РЭДАКЦЫІ. Аўтар узнімае даволі сур'ёзную праблему. Так званыя «аўтографы на партах» робяцца не ноччу, не пасля заняткаў, а на вачах многіх студэнтаў. Ці не пара прыцягнуць да адказнасці «аматараў роспісу»? Запрашаем да размовы усіх, каго хвалюе гэта пытанне.**

СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

# СВЯТЛО ДУШЫ

Шмат гадоў на ніве дзіцячай літаратуры працуе адзін са старэйшых беларускіх пісьменнікаў Васіль Вітка. Ён аўтар многіх кніг, адрасаваных юнаму чытачу. Дзеці палюбілі вершы, вершаваныя казкі, лічылкі, пацешкі паэта. Нязменным поспехам карыстаецца яго «Чытанка-маляванка», якая заслужыла ўсеагульнае прызнанне і прынесла паэту ўдзячнасць маленькіх грамадзян краіны.

У чым жа сакрэт поспеху паэта?

Думаецца, перш за ўсё ў той падкупляючай шчырасці, якой прасякнуты прачулыя вершаваныя радкі, у незвычайнай любві да дзяцей, веданні таямніц іх душы, своеасаблівасцей дзіцячага ўспрымання навакольнага свету.

Галоўны герой Васіля Віткі на гэты раз крыху «падрос». Так, калі ў многіх ранейшых творах, у тым ліку і ў «Чытанцы-маляванцы», ён быў дашкольнікам, то ў кніжцы «Хто памагае сонцу» ён ужо малодшы школьнік, акцябронак. Акцябратам адрасуецца шэраг вершаў, змешчаных у кніжцы («Свята», «Наша зорачка» і інш.). Вось верш «Развітанне з букваром». Кожны радок яго прасякнут радасцю, але адчуваецца разам з тым і засмучэнне: усё ж дзеці развітваюцца са сваім старым сябрам:

Ляцяць, ляцяць сняжынкі
з хмар
І над зямлёю кружаць.
Табе мы дзякуем,
«Буквар».
Бывай, наш добры дружа!

Разгортваем новую кніжку В. Віткі «Хто памагае сонцу» і адразу трапляем у дзівосны свет вобразаў, у асяроддзе цікаўных і дапытлівых герояў, што пачынаюць рабіць свае першыя крокі. І што б гэта ні было— ці праводзіны снежнай бабы, ці расказ пра тое, як буслы выручылі сонейка, што ўгразла ў дрыгве, ці агледзіны восені — усюды перад юнымі чытачамі раскрывае паэт свет невядомы і прыгожы, шматколерны і шматгалосы. В. Вітка, расказваючы пра з'явы прыроды, рэчы, расліны, не проста апісвае іх, а адухаўляе, ачалавечвае, персаніфікуе. І вось ужо ў вобразе «непаслухмянага дожджыка» («Дожджык») мы бачым свавольніка-хлапчука, які «ў завулак сігануў, на трамвай ускочыў... Не зважае на агні, смаліць на чырвоны». Што ж датычыць хлапчука рэальнага, то прысутнічае ў кніжцы і ён. Гэта ў яго на грудзях «ззяе зорка Леніна». Гэта ён радуецца, што «хутка піянерамі станем як адзін». Гэта ён ганарыцца сваім дзедам, бо ў якую рэспубліку з ім ні паедзеш — усюды ў дзеда сябры, усе з ім вітаюцца як са сваім.

Значнае месца ў кніжцы займаюць вершы на ленінскую тэму. Гэта — «Правадыр», «Прадвесне», «Піянеры», «Свята» і інш. На Леніна раўняюцца акцябраты і піянеры, для якіх «чырвоны колер родным стаў», якія жывуць па ленінскіх запаветах і нясуць у будучыню «сцяг Леніна — чырвоны сцяг». Вось як нявымушана і адначасова паэтычна-хараша прыўваходзіць у верш пра вясенні падмаскоўны лес ленінскі матыў:

Дзівосны сон сасонцы
сніцца
Перад світаннем, на зары,
У срэбра бубен б'юць
сініцы,
На флейтах свішчуць
снегіры...
Мільгнула на сасне
ваверка,
На ўсходзе згас світальны
зніч...
Як ён любіў у ціхіх
Горках
Такія раніцы, Ільіч!..

Больш паловы кніжкі займаюць пераклады. В. Вітка на належным узроўні ўзнавіў некаторыя творы рускіх, украінскіх, літоўскіх, латышскіх і балгарскіх паэтаў. Пераклады арганічна ўваходзяць у кніжку, пашыраючы яе тэматычныя далягляды. У прыватнасці, як нельга лепш упісаўся ў яе вядомы верш У. Маякоўскага «Кім быць?», які дзякуючы В. Вітку загучаў па-беларуску натуральна і высокапаэтычна.

Калі гаварыць пра некаторыя прыватныя недахопы выдання (лепш, магчыма, сказаць — недагляды), то яны датычацца перш за ўсё асобных паэтызмаў, што ўжо сустракаліся ў творах іншых паэтаў. Так, у вершы «Лістапад» асноўны, стрыжнявы вобраз — вобраз лісця, якое адлятае ў вырай. Але ж гэты вобраз ужо сустракаўся раней у Максіма Танка: «Звіняць лісты, не адляцеўшыя ў вырай» («Ля помніка Леніну», 1939 г.). Верш «Сяброўкі» пачынаецца так: «Хто там грукае ў акно? Гэта вы, сінічкі? Я прачнулася даўно...». Як тут не згадаць пачатак вядомага верша Р. Бёрнса «Фіндлей» у перакладзе Я. Семяжона: «Хто гэта грукае ў акно? — Хто ж, гэта я, Фіндлей. — Ідзі дамоў, я сплю даўно...».

Васіль Вітка напісаў цікавую і карысную кніжку, якая сабрала на сваіх старонках святло і шчырасць, дабрату і пяшчоту дзіцячай душы.

**А. ПІСЬМЯНКОЎ,**
член гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры філфака.

# ШЭКСПІР. ТРАГЕДЫЯ КАХАННЯ...

**ФОТАРЭПАРТАЖ А. Цыгулёва і Т. Петрашкевіч.**



Рэжысёр шукае рух...



Э. Драбышэўская: якой быць ролі карміліцы?



На адной з апошніх рэпетыцый.

*Калі мы гаворым пра нараджэнне першага пачуцця — успамінаем Рамэо і Джульету. Калі разважаем пра вернасць і пяшчоту — успамінаем Рамэо і Джульету. Калі гаворым пра выбух страсцей і вялікую сілу чалавечай душы—таксама ўспамінаем вобразы, створаныя вечна сучасным Шэкспірам.*

*Сёння трагедыя «Рамэо і Джульета» — на сцэне студэнцкага тэатра універсітэта. Ззаду засталіся рэпетыцыі, пошукі выразнага мастацкага, музычнага і светатанальнага афармлення, паглыбленне ў вобразы герояў.*

*І вось — прэм'ера. Разлятаюцца крылы занавесу, і мы, гледачы, апынаемся на гарадской плошчы старажытнай Вероны... З самай першай сцэны бойкі паміж прыхільнікамі Капулеці і прыхільнікамі Мантэкі да трагічнага канца п'есы спектакль ідзе ў імклівым, усё ўзрастаючым рытме.*

*Нас захапляе дуэт А. Цыгулёва (Рамэо) і Н. Дземідзенкі (Джульета). Цікавы малюнак ролі атрымаўся ў В. Жукава (Капулеці), А. Касцецкага (Мяркуцыо), А. Прастаты (Бянволіо), А. Хілімона (аптэкар), Э. Драбышэўскай (карміліца) і іншых. Звіняць клінкі, гучаць маналогі, нараджаюцца і гінуць інтрыгі, а за сцэнай за ходам спектакля ўважліва сочыць рэжысёр-пастаноўшчык, кіраўнік тэатра, заслужаны артыст Латвійскай ССР Аляксандр Міхайлавіч Озераў. І толькі пасля фіналу ён разам са сваімі вучнямі, студэнтамі БДУ, выйдзе на сцэну пад шчырыя апладысменты ўдзячных гледачоў. Прысутных з'яднала вялікая сіла мастацтва. Героі Шэкспіра паміраюць толькі на сцэне; іх каханне, іх светлыя вобразы працягваюць жыць у нашых сэрцах.*

**С. УСЦІНОВІЧ.**



Закаханыя, што можа быць цудоўней...



«Мужайся, рана не з глыбокіх!..»



Фінал трагедыі.

# НЯХАЙ ЖЫВЕ ТРАДЫЦЫЯ

На адкрыццё дзён фізікаў у актавую залу БДУ папасці было няпроста: запрашальны быў, як кажуць, на вагу золата. Студэнты-фізікі, прадстаўнікі іншых факультэтаў, госці з дзевяці універсітэтаў краіны сабраліся на гэты фестываль (так фізікі назвалі сваё свята), фестываль гумару і весялосці.

— Цяпер святкаванне дзён фізікаў стала ўжо традыцыяй. А пачалося ўсё неяк са звычайнага пасвячэння першакурснікаў у студэнты. Сёе-тое запазычылі ў іншых ВНУ краіны. І вось ужо другі год прымаем гасцей з Масквы, Тбілісі, Днепрапятроўска, Алма-Аты, Новасібірска, Ташкента, Тарту, Гомеля, Казані. А калі фізікі збіраюцца разам, яны задушэўна гавораць аб сваёй навуцы, бо фізікі— гэта лірыкі, — так растлумачыў нам сакратар камітэта камсамола фізфака БДУ М. Абрамчук.

Першым прысутных павіншаваў дэкан фізічнага факультэта І. Зяцькоў. Цёплыя словы ў адрас віноўнікаў свята — першакурснікаў. Затым «руль кіравання» вечарам узяў у свае рукі аргкамітэт.

На сцэну запрашаюцца госці. Іх прывітанні — песні-жарты, песні-ўсмешкі. Вось тут мы і даведаліся ад студэнтаў з Тарту, што «ўнутры зямлі знаходзіцца шар, радыус якога большы за радыус зямлі». А студэнты з МДУ так растлумачылі прычыну святкавання дзён фізікаў: «Гэта свята бывае таму, што ёсць такая навука, як фізіка. Вясной фізікі становяцца лірыкамі, а хімікі (!?) хаваюцца хто куды»...

— Па-першае, мне вельмі спадабаліся людзі, горад. Ну, а студэнцкае свята — само сабою, —сказала пасля вечара Жэня Кузняцова, студэнтка фізфака МДУ.

Аргкамітэт фестывалю працаваў, не пакладаючы рук. Праведзена вялікая падрыхтоўчая работа, распрацаван сцэнарый правядзення свят. Па аднадушнаму меркаванню гасцей і прысутных аргкамітэт са сваёй роляй вядучага справіўся на «выдатна». Тым не менш, як і папярэджвалася, ад смеху ніхто не памёр. Аб тым, што аргкамітэт фестывалю сапраўдны эрудыт, сведчыць выпадак. У аргкамітэт паступіла запіска наступнага зместу: «Вот ду ю нэйм?», на што апошні адказаў: «Ес, іт із»...

— Гэта, канешне, добра, што на ваша свята не прабіцца, — заўважае студэнт з Тбілісі В. Кузняцоў. — Сапраўдны самадзейны тэатр паказалі сягоння фізікі. А колькі маладзёжных песень прагучала на гэтым фестывалі!

Цэлы шэраг дзівосных адкрыццяў быў зроблен на канферэнцыі «Гумарыстычныя праблемы фізікі». Напрыклад, было ўстаноўлена, што ўсе целы падзяляюцца на чужыя і ўласныя, душныя і бяздушныя, што «мастацтва некаторых дзеячоў часам дасягае такіх вышынь, што яго не відаць няўзброеным вокам» і г. д.

10 красавіка адбылося ўрачыстае закрыццё дзён фізікаў.

Студэнт V курса фізфака БДУ Мікалай К. (прасіў не называць прозвішча) сказаў: «Для нас гэта свята года. І хаця мы гаварылі «фестываль гумару і весялосці» і ўсе жартавалі, хто ведае, можа быць хто-небудзь зусім не жартаваў...»

Перад ад'ездам госці падзяліліся з намі сваімі ўражаннямі: «Так пачынаецца сапраўдная дружба. І няхай жыве гэта цудоўная традыцыя — адзначэнне дзён фізікаў, дзён дружбы факультэтаў».

**Н. ЛЕБЕДЗЕВА,**
**студэнтка І курса журфака.**





*НА ЗДЫМКАХ: тэатр мініяцюр фізфака; студэнтаў-фізікаў вітаюць госці.*

*Фота А. ГРАБЧЫКАВА і Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.*

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 02395 Заказ № 596.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.